

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Ліда, 2021 г.*

*Дарагія дзевяцікласнікі!*

*У гэтым навучальным годзе споўнілася б 90 гадоў аднаму з пачынальнікаў дэтэктыўнага жанру ў беларускай літаратуры Уладзіміру Караткевічу. Давайце і мы з вамі сёння пабудзем дэтэктывамі. Ці зможам разгадаць усе лінгвістычныя загадкі і разблытаць літаратуразнаўчыя таямніцы?*

## *БЛАНК ЗАДАННЯЎ*
## 9 клас
## Варыянт 2

**Заданне 1.** Прачытайце тэкст і выканайце заданні да яго.

*Максімальная колькасць балаў –* **6.**

*Экспертыза э(ф,фф)ектыўна ліквідуе наяўныя супярэчнасці. Напрыклад, сведка, пацярпелы або падсудны ўпарта спрабуюць адстаяць сваю версію. У такім выпадку на дапамогу прыходзіць эксперт, які ацэн(...)вае кожны з пачутых варыянтаў і р(а,о)значытанняў на аснове (навукова)абгрунтаваных ведаў. У прыватнасці, гэта можа тычыцца справы аб сутыкненні (аўта)сродкаў, калі кожны з кіроўцаў па-свойму тлумачыць прычыны аварыі.*

| | |
|---|---|
| А | Размяркуйце наступныя словы па слупках у табліцы: *адстаяць, ліквідуе наяўныя, па-свойму, прыходзіць, спрабуюць, сутыкненні.* |
| Б | Запішыце правільна наступныя словы, раскрыўшы дужкі: *(аўта)сродкаў, ацэн(...)вае, (навукова)абгрунтаваных, р(а,о)значытанняў, э(ф,фф)ектыўна.* |



**Заданне 2.** Злачынцы часта замяняюць звыклыя словы незразумелымі, жаргоннымі. Некаторыя агульнаўжывальныя словы таксама “маскіруюцца”, замяняюцца апісальнымі выразамі – перыфразамі. Паспрабуйце “выкрыць” такія моўныя адзінкі: суаднясіце словы з адпаведнымі перыфразамі. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

| | |
|---|---|
| А воўк | 1 гаспадар вадзяной хаткі |
| Б угнаенне | 2 гаспадар зямлі |
| В бабёр | 3 гаспадар начнога поля |
| Г лён | 4 бальзам палёў |
| Д чалавек | 5 гаспадар пушчы |
| Е зубр | 6 беларускі шоўк |
| | 7 надзейны хлеб маёй зямлі |

**Заданне 3.** Злачынца замкнуў каштоўныя кнігі ў сейф. Каб адамкнуць яго, трэба разгадаць кодавае слова. На шчасце, у спешцы злачынца забыў на стале аркуш паперы, на якім запісана зашыфраванае слова. Дапамажыце адчыніць сейф і дастаць адтуль кнігі.

Прачытайце ўрывак з аповесці У. Караткевіча “Чорны замак Альшанскі” і выканайце наступныя заданні.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

*Раніцай, калі я, паснедаўшы, выйшаў з хаты, дык ажно ахнуў, настолькі ўсё вакол было хараша. Невялікая, двароў на пяцьдзясят – семдзесят вёсачка, “прыгарад”, шырока раскінулася па схілах акругленых мяккіх узгоркаў і патанала ў садах, дзе ўжо зялёнымі хмарамі марылі хмызы агрэсту. Нешырокая рачулка дзяліла гэтыя дзве грады ўзгоркаў і самую вёску. Яна змяілася, гэтая рэчка, хутка знікала з вачэй і злева і справа, і таму не адразу можна было зразумець, адкуль далятае пляск вады на млынавым коле. Справа, далёка, відаць было ссыпныя магазіны.*

| | |
|---|---|
| А | Выпішыце ў пачатковай форме слова, утворанае суфіксальна-постфіксальным спосабам. |
| Б | Выпішыце дзеяслоў, утвораны ад выклічніка. |
| В | Выпішыце слова з нулявым канчаткам, утворанае бяссуфіксным спосабам. |
| Г | Выпішыце прыслоўе, утворанае ад назоўніка прыставачна-суфіксальным спосабам. |
| Д | Выпішыце слова, якое мае наступную марфемную будову: прыстаўка, корань, нулявы суфікс, канчатак. |
| Е | Паводле пачатковых літар кожнага з указаных у прыведзенай паслядоўнасці папярэдніх слоў павінна атрымацца слова, адно са значэнняў якога – “катэгорыя грамадзян, якія прайшлі вайсковую службу і прызываюцца зноў у войска ў выпадку неабходнасці”. Запішыце гэта слова. Яно і будзе кодам для адкрыцця сейфа. |

**Заданне 4.** У мастацкіх творах У. Караткевіча важную стылеўтваральную ролю адыгрываюць займеннікі. Яны не толькі выконваюць уласцівую для іх замяняльную функцыю, але і ў значнай ступені дапамагаюць фарміраваць паўнацэнную міжрадковую інфармацыю (падтэкст). Запоўніце табліцу на аснове выкарыстаных у прапанаваных сказах займеннікаў.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

А. У мяне закруцілася ў галаве. Яна за апошні час так трашчала, што я баяўся, а раптам гэта я ў забыцці чагосьці нарабіў.

Б. Я не бываў раней у яго хаце і тут ужо быў сапраўды здзіўлены. Тут, здаецца, усё было разлічана не на тое, каб супакоіць чалавека, а, наадварот, узвінціць ягоныя нервы да апошняга.

В. У такую раніцу добра не ў падзямеллі лазіць, а сядзець на прызбе, на сонейку, каб ветрык не даставаў, слухаць пеўняў і думаць аб сім-тым.

Г. Яшчэ раз – і на гэты раз ужо назаўсёды – я зразумеў: нічым на свеце, ніякімі нават вышэйшымі меркаваннямі нельга апраўдваць крыўду, якую наносяць жывому чалавеку.

**Заданне 5.** Уявіце, што Вы апынуліся ў складаным становішчы, і сябар дапамог годна выйсці з сітуацыі. Да прапанаванай часткі сказа прыдумайце працяг, каб атрымаліся, калі магчыма, складаназалежныя сказы з рознымі відамі даданых частак. Калі гэта немагчыма зрабіць, то патлумачце прычыну. Запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

*Я незвычайна ўдзячны сябру, .....*

**Заданне 6.** Паняцці “літаратурная мова” і “мова мастацкай літаратуры” зусім не тоесныя. Адхіленні ад літаратурных нормаў часта звязаны не толькі з жаданнем аўтара зрабіць сваё маўленне больш даступным для чытача, але і з індывідуальным стылем пісьменніка. Уладзімір Караткевіч мае ўнікальны стыль, у межах якога кожная лексічная адзінка, кожны знак прыпынку і элемент афармлення займае сваё належнае месца.

> Любую спробу рэдактараў змяніць тэкст У. Караткевіч успрымаў даволі катэгарычна: “І коскі з месца не зрушу!” Застаецца толькі пагадзіцца з пазіцыяй аўтара, бо нават тое, што ў літаратурнай мове ўяўляецца памылкай, вельмі арганічна ўплятаецца ў тканіну яго неверагодна цікавых тэкстаў.

Уявіце сябе рэдактарамі і прасачыце, як маглі б змяніцца наступныя сказы, калі б яны былі апрацаваны ў адпаведнасці з сучаснымі беларускімі літаратурнымі нормамі. Назавіце правіла, якім вы кіраваліся пры праўцы. Калі памылкі няма, то замест тлумачэння напішыце: “памылкі няма”.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| | **Сказ з твора У. Караткевіча** |
|---|---|
| А | Але прайшоў час, лапы яшчэ разы са два дакраналіся да маёй галавы, а вазок не скакаў па карэннях, каціў роўна і гладка. І коні аніводнага разу не спыніліся. |
| Б | Я адчуваў, як вецер гэтых стагоддзяў праляцеў за маёй спінаю і ўзняў валасы на маёй галаве. |
| В | Ён [Берман-Гацэвіч] змоўк, уткнуўшы твар у далоні, пальцы на якіх, белыя, артыстычныя, былі даўжэй за пальцы звычайнага чалавека ў два разы. |
| Г | Я ўстаў, падышоў да акна і прыпаў лобам да халоднай шыбы. |
| Д | Тры вялізных хвоі ўжо вымалёўваліся над чэзлымі хмызамі, а над імі была такая цемра, такое змрочнае неба… |
| Е | Я прыйшоў у сваю бакоўку і заваліўся спаць. Досыць рана. І нават у сне адчуваў, як у мяне баліць галава. |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

В чем задача детектива – дать отдых напряженному современным ритмом жизни интеллекту читателя или, наоборот, заставить мозг поработать в поисках решения детективной загадки? В талантливых детективных историях читателю предоставляется возможность самостоятельно разрешить это уравнение при помощи готовых фактов, что потребует определенной умственной работы. Таким образом, чтение детектива сродни решению хитрых арифметических задач.

*(В.П. Булычева)*

**Заданне 8.** Сапраўдны дэтэктыў павінен умець класіфікаваць і адбіраць пэўныя факты. Прапануем і Вам класіфікаваць тэрміны: вызначце, якія з прапанаваных тэрмінаў адносяцца толькі да эпічных твораў, якія толькі да лірычных, якія толькі да драматычных, а якія маюць універсальны характар (могуць адносіцца да ўсіх трох літаратурных родаў). Не забывайце, што сярод тэрмінаў могуць сустракацца тыя, якія не адносяцца ні да адной з прапанаваных груп. Запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

*Літаратурныя тэрміны:* трыялет, фарс, рэмарка, іронія, байка, нарыс, апавяданне, актава, ода, вадэвіль, апісанне, навела, дэталь, санет, камедыя, гумар, пародыя, ліра-эпас, жыціе, лірычны герой.

**Заданне 9.** Дапамажыце літаратурным героям успомніць, як іх завуць, з якога яны твора і хто аўтар гэтага твора. Апісанні літаратурных герояў пададзены ніжэй.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

| | |
|---|---|
| А | Сярэдняга веку вусаты мужчына, які вельмі любіць працаваць, займацца з дзецьмі. Мае шкодную звычку курыць, таму заўсёды носіць кісет. Па характары вельмі лагодны, схільны да эксперыментаў (аднойчы для цікавасці зварыў клёцкі ў бярозавіку), самакрытычны, умее прызнаваць свае памылкі. |

| | |
|---|---|
| Б | Ураджэнец Магілёва, нашчадак сепаратысцкай фаміліі. Афіцэр, які камандуе ротай салдат на левым беразе Дняпра. Гатовы на любыя подлыя ўчынкі: аднойчы, выконваючы сакрэтны загад, перашкодзіў жанчыне выратаваць ад смерці мужа. Людзям здаецца, што мае халодныя вочы. |
| В | Настаўніца з мілым, прыгожым тварам і белымі маленькімі рукамі, доўгімі чорнымі вейкамі. Чыста размаўляе па-польску. Вельмі любіць сваіх вучняў, гатова прыйсці ім на дапамогу. Аднойчы падарыла свайму вучню кнігу Б. Пруса “Навелы”. |
| Г | 80-гадовы мужчына, які жыве ў паміраючай вёсцы на ўсходзе Беларусі. Вельмі любіць сваю вёску і нікуды не збіраецца пераязджаць. Нягледзячы на ўзрост і хваробы, шмат працу, сам пра сябе кажа: “Я хлебароб вечны…” У гады вайны быў у партызанах. Мае незвычайную звычку размаўляць з Сонцам. Сын Грышка жыве асобна невядома дзе. |

**Заданне 10.** Хакер узламаў камп’ютар галоўнага рэдактара літаратурнай энцыклапедыі і пашкодзіў артыкул, прысвечаны “Магіле льва”: наўмысна зрабіў памылкі, а частку інфармацыі знішчыў. Сярод знішчанай інфармацыі быў фактычны матэрыял пра сам твор і элементы яго аналізу. Прачытайце артыкул, які пакінуў хакер, дапамажыце выправіць памылкі. Запішыце выпраўлены варыянт. Калі ёсць жаданне, то дапішыце артыкул, каб атрымаць болей балаў.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

